# Беларуская мова. III клас

## Тэмы «Прыстаўка», «Суфікс»

### Урок 41. Прыстаўка

***Мэты:*** пазнаёміць з прыстаўкай як значымай часткай слова, яе роляй у слове; вучыць знаходзіць прыстаўкі ў словах і абазначаць іх графічна, утвараць словы пры дапамозе прыставак; развіваць мысленне навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнік народнымі прыметамі; развіваць назіральнасць, выхоўваць пяшчотныя адносіны да матуль.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *Рыбака, па, пазнаюць, лодцы. Рыбак, не, дажджу, баіцца.*

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш, які вы запісалі. Якія словы ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні? *(Ходзяць, сябруем.)* Што абазначае выраз *сябраваць з алоўкамі*? *(Умець і любіць маляваць.)* Назавіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. *(Алоўкі, алоўкамі.)* Якія канчаткі вы выдзелілі ў словах? Які корань і канчатак выдзелілі ў словах *паперы, ходзяць, хочам*?

**ІІ. Паўтарэнне.**

***Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

На дошцы прымацаваны карткі са словамі:

1) Рыбака, па, пазнаюць, лодцы.

2) Рыбак, не, дажджу, баіцца.

— З асобных слоў састаўце прыказкі. Чаму так гавораць? (Дзеці састаўляюць першую прыказку, тлумачаць яе значэнне. Адзін вучань выходзіць да дошкі і размяшчае карткі са словамі ў патрэбным парадку: *Рыбака пазнаюць па лодцы.* Аналагічная праца праводзіцца з другой групай слоў.) Знайдзіце ў прыказках формы аднаго і таго ж слова. Выпішыце іх, выдзеліце канчаткі. (Адзін вучань выдзяляе канчаткі ў словах, запісаных на дошцы, астатнія вучні працуюць у сшытках.) Які корань мае слова *рыбак*? (Вучні вусна падбіраюць да слова аднакаранёвыя, вылучаюць корань -рыб-.) Якія часткі можна вылучыць у слове? Што такое корань, канчатак?

**ІІІ. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з адной часткай слова.

***2. Праца з падручнікам.***

— Мы пачынаем працу з другой часткай падручніка. Адгарніце яго на с. 3.

Практыкаванне 1.

— Разгледзьце малюнкі. Прачытайце спалучэнні слоў. Вусна складзіце па малюнках апавяданне на тэму «Дарога ў школу». (Вучні складаюць сказы з апорай на малюнкі, або настаўнік просіць дапоўніць наступныя сказы патрэбнымі спалучэннямі слоў: *Раніцай сяброўкі ... ... ... і разам ідуць у школу. Таня і Іра акуратна ... ... . Яны не спяшаючыся ... ... ... школы. Там дзяўчынкі сустракаюць аднакласнікаў і разам з імі ... ... .*)

— Прачытайце выдзеленыя словы? Што аб'ядноўвае іх? *(Гэта аднакаранёвыя словы.)* Запішыце аднакаранёвыя словы, выдзеліце ў іх корань. (Настаўнік запісвае словы на дошцы, вучні — у сшытках. Пасля гэтага адзін з вучняў выходзіць да дошкі і выдзяляе ў словах корань. Астатнія выконваюць гэтае заданне ў сшытках.) Якімі часткамі адрозніваюцца словы? Выдзеліце знакам (настаўнік дэманструе абазначэнне прыстаўкі) часткі, якімі яны адрозніваюцца. (Настаўнік выдзяляе прыстаўкі ў словах, запісаных на дошцы, вучні робяць гэта ў сшытках.) Дзе знаходзяцца гэтыя часткі: перад коранем ці пасля яго?

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 4.

— Што такое прыстаўка?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 2.

— «Падыміцеся» па лесвіцы і ўтварыце пры дапамозе прыставак новыя словы ад прапанаваных. Запішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх прыстаўкі і корань. (Два вучні працуюць каля дошкі. Кожны запісвае адну групу аднакаранёвых слоў, выдзяляе ў іх корань і прыстаўкі. Астатнія вучні запісваюць словы ў сшыткі.)

***Праца са слоўнікавым словам звінець.***

— Мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *звінець.* Паслухайце, як я вымаўлю яго: [з'в'ін'э'ц']. Вымавіце гэтае слова ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў ім. Назавіце мяккія зычныя гукі ў гэтым слове. Прачытайце слова на с. 4 падручніка. Ці перадаецца мяккасць гука [з'] на пісьме? Прыдумайце сказы са словамі, аднакаранёвымі да слова *звінець. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Выбіраюцца і запісваюцца з каменціраваннем два найбольш удалых сказа.)*

Практыкаванне 3.

— Прачытайце верш. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Ці ўсе словы ў ім былі зразумелыя? Звярніцеся да слоўніка і адкажыце, што абазначае выраз *пасварыся з сонікам.* Чаму верш мае такую назву? Ці падобны ён на песеньку? Які настой можа быць у такой песенькі? Якія словы падказалі вам, што матуля з пяшчотай і любоўю звяртаецца да сына? *(Сынку-сыночак, чубочак, з сонікам, з сонейкам, хуценька, вадзіцы, малачка.)* Выпішыце выдзеленыя словы, вусна падбярыце да іх аднакаранёвыя. Выдзеліце ў запісаных словах прыстаўкі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі: ***па****сварыся — сварыся,* ***па****вітайся — вітайся,* ***прас****пяваў — спяваў,* ***пры****нясу — нясу,* ***па****мыйся — мыйся,* ***на****піся — піць,* ***с****пяваць — пець.* Можна звярнуць ўвагу на тое, што ў слове ***пра-с-****пяваў* дзве прыстаўкі.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 4.

— Сучаснае прагназаванне надвор'я заснавана на вывучэнні заканамернасцяў развіцця атмасферных працэсаў. Яно мае трывалую навуковую і тэхнічную аснову. Разам з тым у паўсядзённым жыцці, асабліва на адпачынку — у турпаходзе, на паляванні або рыбалцы, прагназаваць надвор'е можна па народных прыметах. Яны заснаваны на назіраннях за навакольным асяроддзем, з'явамі прыроды, станам жывёл і раслін. З даўніх часоў людзі вядуць гэтыя назіранні. Прачытайце і запомніце народныя прыметы. (Адзін з вучняў чытае сказы.) Спішыце. Вусна падбярыце да выдзеленых слоў аднакаранёвыя. Карыстайцеся словамі для даведкі. Абазначце ў выдзеленых словах корань і прыстаўку. (Вучні запісваюць сказы з каменціраваннем.)

***Развіццё маўлення.***

— Якія яшчэ прыметы пагаршэння надвор'я вы ведаеце? (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Калі дзеці не змаглі назваць ні адной дадатковай прыметы, настаўнік прыводзіць свой прыклад: чырвоная зара сведчыць аб наяўнасці вялікай колькасці пары ў атмасферы, што абавязкова прывядзе да павелічэння воблачнасці і пагаршэння надвор'я.) Да наступнага ўрока тыя вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі прыроды, могуць выканаць заданне для эрудытаў на с. 5.

Практыкаванне 5.

— Прачытайце першы рад слоў. Як вы думаеце, якое слова тут лішняе. Чаму? *(Палохаць, паколькі ў ім няма прыстаўкі. Усе астатнія словы маюць прыстаўку* па-. Калі ў вучняў узнікаюць цяжкасці пры вылучэнні лішняга слова, настаўнік просіць звярнуць увагу на склад гэтых слоў.*)* Запішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх прыстаўку. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія працуюць у сшытках. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі групамі слоў.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісана слова *выхад*.

— З якой часткай слова пазнаёміліся на ўроку? Што такое прыстаўка? Прачытайце слова, запісанае на дошцы. Выдзеліце ў ім корань і прыстаўку. (Адзін вучань выходзіць да дошкі і выдзяляе корань і прыстаўку ў слове.) Падбярыце да слова аднакаранёвыя з іншымі прыстаўкамі.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 6.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае.) На што падобнае поле лёну? Якія кветкі лічацца сімваламі Беларусі? *(Лён, васілёк.)* На якім дзяржаўным сімвале нашай краіны можна ўбачыць кветкі лёну? Якая кветка з'яўляецца сімвалам Славянскага базару ў Віцебску? (Калі ў дзяцей узнікнуць цяжкасці падчас адказу на пытанні, настаўнік можа прапанаваць жадаючым да наступнага ўрока знайсці патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце.) Дома вам неабходна будзе спісаць верш, абазначыць прыстаўкі ў выдзеленых словах, знайсці і падкрэсліць формы аднаго і таго ж слова.

## Урок 42. Прыстаўка

***Мэты:*** паглыбіць разуменне ролі прыстаўкі ў фарміраванні значэння слова, вучыць дакладна ўжываць словы з сінанімічнымі і антанімічнымі прыстаўкамі ў маўленні; узбагачаць слоўнік навучэнцаў словамі з прыстаўкамі, развіваць граматычны лад маўлення; выхоўваць уважлівае стаўленне да слова.

***Абсталяванне:*** эмблема Славянскага базару, плакат з алгарытмам вызначэння прыстаўкі ў слове.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш. Якія прыстаўкі вы выдзелілі ў словах *пабачыце, удыхнулі, сабралі, пашылі*? Што такое прыстаўка? Назавіце формы аднаго і таго ж слова, якія сустрэліся ў вершы. *(Кветачак, кветачкі.)*

Калі дзеці рыхтавалі да ўрока інфармацыю пра кветкі, якія лічацца сімваламі Беларусі, то паведамленні заслухоўваюцца, а настаўнік звяртае ўвагу вучняў на малюнак герба Беларусі, змешчаны ў класе, і на эмблему Славянскага базару:

— Пра якія прыметы пагаршэння надвор'я вы можаце расказаць? (Заслухоўваюцца паведамленні падрыхтаваных вучняў. Яны могуць быць прыкладна такімі: *Ластаўкі і стрыжы лётаюць нізка над зямлёй — быць дажджу. Мурашкі перад дажджом спяшаюцца зачыніць уваходы ў мурашнікі. Перад дажджом расліны згортваюць пялёсткі сваіх кветак. Адчуваючы набліжэнне дажджу, куры закопваюцца ў пыл. Рачныя і азёрныя чайкі ў добрае надвор'е садзяцца на ваду, а перад дажджом разгульваюць па прыбярэжным пяску.*)

**II. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 7.

— Прачытайце верш. (Вучні чытаюць самі сабе.) Да чаго заклікае паэт у вершы? Якія галасы ў прыроды? (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.) Выпішыце выдзеленыя словы ў два слупкі: у адзін — словы з прыстаўкамі, у другі — без прыставак. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.) Якія з выпісаных слоў з'яўляюцца аднакаранёвымі? *(**Пагоду**, не**пагоду**.)* Выдзеліце ў іх корань.

Практыкаванне 8.

— Давайце звернемся да практыкавання 8 і складзём па падказках алгарытм вызначэння прыстаўкі ў слове *пагаварыць*.

— Прачытайце словы пад пунктам 1. Якія гэта словы? *(Аднакаранёвыя.)* Прачытайце аднакаранёвыя словы з прыстаўкамі. Прачытайце аднакаранёвыя словы без прыставак. Назавіце першы крок у вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 1 патрэбнымі словамі: *Падбіраем да слова аднакаранёвыя словы без **прыставак** або з іншымі **прыстаўкамі**.*)

— Якая частка выдзелена ў аднакаранёвых словах пад пунктам 2? Назавіце другі крок у вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 2 патрэбным словам: *Знаходзім у аднакаранёвых словах **корань**.*)

— Якая частка выдзелена ў слове *пагаварыць*, запісаным пад пунктам 3? Назавіце трэці крок у вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 3 патрэбным словам: *Частка слова, якая стаіць перад коранем, і будзе **прыстаўкай**.*)

— Як абазначана прыстаўка ў слове, запісаным пад пунктам 4? Назавіце чацвёрты крок у вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 4 патрэбнымі словамі: *Абазначаем прыстаўку ў слове **спецыяльным знакам**.*)

— Пералічыце яшчэ раз паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Адзін з вучняў узнаўляе алгарытм. Настаўнік вывешвае на дошку адпаведны плакат.)

Практыкаванне 9.

— Прачытайце словы. На якія тры групы іх можна размеркаваць? (Калі ў вучняў узнікаюць цяжкасці пры адказе на пытанне, настаўнік просіць звярнуць увагу на прыстаўкі ў словах.) Запішыце асобна словы кожнай групы. Выдзеліце ў іх прыстаўкі. (Вучні самастойна запісваюць словы ў тры слупкі. Пасля выканання задання праводзіцца калектыўная праверка напісанага. На прыкладзе аднаго слова вучні тлумачаць, як вылучалі прыстаўку ў ім.)

Практыкаванне 10.

— Прачытайце верш. (Адзін з вучняў чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Які настрой у вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Як мама выканала просьбу дачушкі? Знайдзіце і выпішыце словы з прыстаўкамі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць у сшыткі словы *абудзілася, здзівілася, уключыце, расхінула, зазірнула.* Вучань каля дошкі тлумачыць, як вылучыў у слове прыстаўку. Напрыклад, *абудзілася — бýдзіць — корань будз-, прыстаўка а-; здзівілася — дзіва, уключыце — адключыце, расхінула — адхінула, адхінаць, зазірнула — пазіраць, позірк.*)

Падкрэсліце тыя з выпісаных слоў, якія ўжыты ў вершы ў пераносным значэнні. *(Уключыце, зазірнула.)* Да выдзеленага слова падбярыце і запішыце аднакаранёвае з супрацьлеглым значэннем. Абазначце ў аднакаранёвых словах корань і прыстаўку. *(У-**ключ**ыце — вы-**ключ**ыце.)*

***Праца са слоўнікавым словам* выйсці.**

— Мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *выйсці*. Паслухайце, як я вымаўлю яго: [вый'с'ц'і]. Вымавіце гэтае слова ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў ім. Назавіце мяккія зычныя гукі ў гэтым слове. Прачытайце слова на с. 9 падручніка. Ці перадаецца мяккасць гука [с'] на пісьме?

Практыкаванне 11.

— Прачытайце. Падбярыце да кожнага слова аднакаранёвае з супрацьлеглым значэннем. Запішыце пары слоў. Выдзеліце прыстаўкі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць у сшыткі пары слоў.) Якую прыстаўку мае слоўнікавае слова? З якога гука пачынаецца корань у гэтым слове? Падкрэсліце адпаведную літару. Са слоўнікавым словам і антонімам да яго прыдумайце сказы. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Выбіраюцца і запісваюцца два найбольш удалых сказа.)

Практыкаванне 12.

— Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце выдзеленыя словы на аднакаранёвыя з прыстаўкамі раз-, пра-, у-, з-так, каб атрымаліся блізкія па значэнні спалучэнні слоў. (Вучні па чарзе ўтвараюць блізкія па значэнні спалучэнні слоў да прапанаваных.)

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісана слова *прачытаць*.

— Прачытайце слова, запісанае на дошцы. Прыгадайце алгарытм вызначэння прыстаўкі ў слове і выдзеліце ў ім прыстаўку. (Адзін вучань называе паслядоўнасць дзеянняў для вызначэння прыстаўкі ў слове, выходзіць да дошкі і выдзяляе прыстаўку ў слове *прачытаць*.) Падбярыце да слова аднакаранёвыя з іншымі прыстаўкамі.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 13.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць тэкст, дапісваючы ў словы патрэбныя прыстаўкі. (Паколькі ў словы можна дапісаць розныя прыстаўкі з прапанаваных, пажадана прачытаць тэкст у класе і ў ходзе калектыўнай гутаркі вырашыць, якімі словамі трэба дапоўніць сказы, якія прыстаўкі прапушчаны ў словах.)

## Урок 43. Правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-, перад-, прад-

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўкі ў словах, фарміраваць навык правапісу слоў з прыстаўкамі *аб-, ад-, над-, пад-, перад-, прад-;* развіваць арфаграфічную пільнасць, узбагачаць слоўнік навучэнцаў народнымі прыметамі; развіваць назіральнасць, любоў да прыроды.

***Абсталяванне:*** плакат з алгарытмам вызначэння прыстаўкі ў слове.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст, які вы запісалі. Назавіце словы, у якія дапісалі прыстаўкі. Якія прыстаўкі вы выдзелілі ў словах *пракрычала, прытаіўся, задрамаў, аблеплены, паклікала, пагрэцца*?

**II. Паўтарэнне.**

***Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

— Паглядзіце на плакат. (На дошцы вісіць плакат, на якім адлюстраваны алгарытм вызначэння прыстаўкі ў слове, пры гэтым апісанне другога і чацвёртага крокаў алгарытму закрыта палоскамі паперы.) Аднавіце паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Дзеці называюць паслядоўнасць дзеянняў, настаўнік адкрывае апісанне другога і чацвёртага крокаў алгарытму).

На дошцы запісаны верш:

Пілiп і камп'ютар
Толькі ў хату **ўбег** Піліп —
да камп'ютара прыліп.
Бацька сварыцца:
— Пiлiпка,
вунь цябе чакае скрыпка.
Ты б музыкам стаў,
калі б
ад камп'ютара адліп.

*Г. Бураўкін* [1]

— Прачытайце верш. Што хвалюе бацьку? Якую параду можна даць Піліпу? (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.) Знайдзіце ў вершы аднакаранёвыя словы. *(Прыліп — адліп, Піліп — Піліпка.)* Выдзеліце ў іх корань. Якія з гэтых слоў маюць супрацьлеглае значэнне? Выдзеліце тую частку слова, якая надае ім гэтае значэнне. (Адзін з вучняў выходзіць да дошкі і выдзяляе прыстаўкі ў словах.) У прамым ці пераносным значэнні ўжыты словы *прыліп, адліп* у вершы? Выпішыце выдзеленае слова. Падбярыце да яго аднакаранёвае слова з супрацьлеглым значэннем. *(Убег — выбег.)* Выдзеліце ў запісаных словах прыстаўкі.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з правапісам некаторых прыставак.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 14.

— Прачытайце словы. Правільна вымавіце гукі на месцы выдзеленых літар. (Адзін вучань чытае пары слоў, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Назавіце прыстаўкі ў словах. *(*[ат]–[ад].*)* Чым адрозніваецца вымаўленне прыставак у кожнай пары слоў? *(Гукамі* [т]–[д].*)* Чаму так вымаўляюцца прыстаўкі? *(Перад глухімі зычным апошні гук прыстаўкі аглушаецца.)* Спішыце пары слоў. Абазначце ў іх прыстаўкі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць у сшыткі пары слоў.) Ці аднолькава пішуцца прыстаўкі ў кожнай пары слоў?

***Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 10.

— Якія прыстаўкі пішуцца нязменна?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна.

***Праца ў парах.***

Практыкаванне 15.

— Разгледзьце схему. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу прыставак, што заканчваюцца на *б, д*. (Вучні закрываюць лістом паперы правіла на с. 10 і з апорай на схему расказваць яго адзін аднаму.)

— Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правапіс гэтых прыставак. (Вучні выконваюць заданне ў парах. Кожная пара вучняў прад'яўляе свой малюнак класу. Выбіраюцца найбольш удалыя схемы і вывешваюцца на дошку.)

Практыкаванне 16.

— Пры дапамозе прыставак *ад-, пад-, прад-, аб-* утварыце ўсе магчымыя аднакаранёвыя словы ад прапанаваных. Абазначце ў словах корань і прыстаўку. (Шэсць вучняў па чарзе выходзяць да дошкі, утвараюць аднакаранёвыя словы, запісваюць іх, выдзяляюць у іх корань і прыстаўку. Астатнія вучні запісваюць словы ў сшыткі.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 17.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць «ланцужком».) Пра якія незвычайныя паводзіны ластавак вы даведаліся

з яго? Разгледзьце малюнак. Якім сказам з тэксту можна яго падпісаць? *(Клапатлівыя бацькі час ад часу падлятаюць да дзяцей, а тыя шырока разяваюць свае дзюбкі.)* Выпішыце выдзеленыя словы. Устаўце на месцы пропускаў патрэбныя літары. Абазначце ў словах прыстаўкі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.) Якое слоўнікавае слова з'яўляецца аднакаранёвым да слова *пайшоў* (пайсці)? *(Выйсці.)* Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы і выпішыце іх. (Адзін вучань працуе каля дошкі, запісвае словы ***ластаўкі — ластавачкі, дождж — дажджавой.*** Астатнія выконваюць заданне ў сшытках.)

Практыкаванне 18.

— Прачытайце народныя прыметы і запомніце іх. (Два вучні чытаюць сказы, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Спішыце, устаўляючы на месцы пропускаў патрэбныя літары. Абазначце ў выдзеленых словах прыстаўкі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

***Праца са слоўнікавым словам адчыніць.***

— Мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *адчыніць*. Паслухайце, як я вымаўлю яго: [ачын'іц']. Вымавіце гэтае слова ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў ім. Назавіце падоўжаны гук у гэтым слове. Прачытайце слова на с. 13 падручніка. На месцы якога спалучэння літар вымаўляецца гук [ч]? Запішыце слоўнікавае слова, арфаграфічна правільна вымаўляючы яго.

Практыкаванне 19.

— Прачытайце словы. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы-антонімы. Запішыце пары слоў. Выдзеліце ў іх прыстаўкі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках.) Якую прыстаўку вы выдзелілі ў слоўнікавым слове? З якой літары пачынаецца корань у гэтым слове? Прыдумайце сказ са слоўнікавым словам. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Выбіраецца і запісваецца найбольш удалы сказ.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы змешчаны зробленыя вучнямі апорныя схемы, малюнкі і запісаны наступныя спалучэнні слоў:

*..віць дрэва* *..ліць вады* *..вячэрні час*
*..вязаць каня* *..бачыць небяспеку* *зрабіць ..піс*

— З апорай на любую схему або малюнак узнавіце правіла правапісу прыставак, якія заканчваюцца на *б, д*. Прачытайце спалучэнні слоў, дапаўняючы словы патрэбнымі прыстаўкамі. Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі. (Вучні па чарзе выходзяць да дошкі і дапісваюць патрэбныя прыстаўкі ў словы. Звяртаецца ўвага на тое, што ў спалучэнні *..ліць вады* слова можна дапоўніць прыстаўкамі *ад-, пад-*.)

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 20.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе адгадаць загадкі, спісаць адну з іх на выбар, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. У выдзеленых словах трэба будзе абазначыць прыстаўкі.

## Урок 44. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з-* (*с-*)

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўку і корань у словах, фарміраваць навык правапісу слоў з прыстаўкамі, якія заканчваюцца на *з-* (*с-*); развіваць арфаграфічную пільнасць, узбагачаць слоўнік навучэнцаў народнымі прыметамі; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі: *адлятаць, адзінка, адмыць, адзіночка, адміністрацыя, адпаласкаць, адрас, адпіць, адукацыя, адпрацаваць.*

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце загадку, якую вы запісалі. Якую адгадку яна мае? (Два вучні, якія запісалі розныя загадкі, чытаюць іх, называюць словы-адгадкі.) Якія літары вы ўставілі ў словы *абвяшчае, адгадку, падкажы?* Якія прыстаўкі маюць гэтыя словы? Як пішуцца прыстаўкі, што заканчваюцца на *б, д*? Назавіце гэтыя прыстаўкі. Якія прыстаўкі вы вылучылі ў словах *досвітку, уночы*?

**II. Паўтарэнне.**

***Праца ў парах.***

На кожную парту раздаюцца карткі са словамі. Гэтыя ж словы прымацаваны на дошцы:

*адлятаць, адзінка, адмыць, адзіночка, адміністрацыя, адпаласкаць, адрас, адпіць, адукацыя, адпрацаваць.*

— Прачытайце словы на картках. Размяркуйце іх на дзве групы. (Два вучні, якія першымі правільна выканалі заданне, выходзяць да дошкі, размяшчаюць словы ў два слупкі. Настаўнік просіць назваць прыметы, па якіх словы былі аб'яднаны ў групы. Пасля вылучэння гэтых прымет (з прыстаўкай *ад-* і без прыстаўкі) вучні выдзяляюць у словах прыстаўку.)

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з правапісам яшчэ некалькіх прыставак.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 21.

— Прачытайце пары слоў. Спішыце. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.) Выдзеліце прыстаўкі ў словах. Якімі літарамі адрозніваюцца прыстаўкі ў кожнай пары слоў? *(З/с.)* У кожным слове падкрэсліце першую літару кораня. Які гук яна абазначае? (Звяртаецца ўвага на такую характарыстыку зычнага гука, як звонкі або глухі.) Як вы думаеце, ад чаго залежыць правапіс літар *с, з* у прыстаўках? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

***Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 14.

— Калі ў прыстаўках *з-/с-, раз-/рас-, без-/бес-, уз-/ус-* пішацца літара *з*, а калі — *с*?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна.

***Праца ў парах.***

Практыкаванне 22.

— Разгледзьце схему. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу прыставак, што заканчваюцца на *з, с.* (Вучні закрываюць лістом паперы правіла і з апорай на схему расказваць яго адзін аднаму.)

— Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правапіс гэтых прыставак. (Вучні выконваюць заданне ў парах. Кожная пара вучняў прад'яўляе свой малюнак класу. Выбіраюцца найбольш удалыя схемы і вывешваюцца на дошку.)

Практыкаванне 23.

— Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі. Падкрэсліце першую літару кораня. (Тры вучні па чарзе запісваюць словы на дошкі, астатнія — у сшыткі.) Значэнне якіх слоў вам было незразумелым? (Тлумачыцца значэнне тых слоў, разуменне значэння якіх выклікала цяжкасці ў вучняў.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 24.

— Прачытайце верш. (Два вучні чытаюць верш па строфах, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Які занятак знайшла сабе дзяўчынка? За што пахвалілі яе бацькі? Чаму верш мае такую назву? Выпішыце з верша выдзеленыя словы, устаўляючы патрэбныя літары на мес-

цы пропускаў. Выдзеліце ў словах прыстаўкі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.) Знайдзіце і назавіце ў вершы словы, вымаўленне якіх адрозніваецца адным гукам. *(Поля — полі.)* Якімі гукамі адрозніваюцца словы? Якімі літарамі адрозніваецца напісанне гэтых слоў?

Практыкаванне 25.

— Прачытайце народныя прыметы і запомніце іх. (Два вучні чытаюць сказы, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары ў словы. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага. Настаўнік запісвае на дошцы словы *злятаюцца, усплёсквае*.) Абазначце ў словах *злятаюцца, усплёсквае* прыстаўку, падкрэсліце першую літару кораня. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы змешчаны зробленыя вучнямі апорныя схемы, малюнкі і запісаны наступныя словы:

..борны, ..палоханы, ..вілісты, ..пісаны, ..менны, ..правядлівы.

— З апорай на любую схему або малюнак узнавіце правіла правапісу прыставак, якія заканчваюцца на *з, с*. Прачытайце словы, дапаўняючы іх прыстаўкамі *з-* або *с-*. Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі. (Вучні па чарзе выходзяць да дошкі і дапісваюць патрэбныя прыстаўкі ў словы.)

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 26.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. У выдзеленых словах трэба будзе абазначыць прыстаўкі.

## Урок 45. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з-* (*с-*)

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўку і корань у словах, адпрацоўваць навык правапісу слоў з прыстаўкамі, якія заканчваюцца на *з-* (*с-*); развіваць арфаграфічную пільнасць, узбагачаць слоўнік навучэнцаў народнымі прыметамі; развіваць пачуццё гумару, выхоўваць культуру маўлення.



***Абсталяванне:*** плакат з алгарытмам выбару напісання *з, с* у прыстаўках, карткі са словамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце калыханку, якую вы запісалі дома. Хто і з якім пачуццём спявае яе дзіцяці? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Якія літары вы ўставілі ў словы *сплялі, узляцелі, разгайдае*? Якія прыстаўкі маюць гэтыя словы? Як пішуцца прыстаўкі, што заканчваюцца на *з, с?* (Вучні прыгадваюць адпаведнае правіла.) Якія прыстаўкі вы вылучылі ў словах *засынае, паглядзі, невысока, убачыш*? Як вызначыць прыстаўку ў слове? (Вучні прыгадваюць алгарытм вызначэння прыстаўкі ў слове.)

**II. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 27.

— Давайце звернемся да практыкавання 27 і складзём па падказках алгарытм выбару напісання *з, с* у прыстаўках.

— Прачытайце словы пад пунктам 1. Якія часткі выдзелены ў гэтых словах? *(Прыстаўка, корань.)* Назавіце першы крок у выбары напісання *з, с* у прыстаўках. (Навучэнцы дапаўняюць сказы з пункта 1 патрэбнымі словамі: *Вымаўляем слова. Вызначаем у ім* ***корань*** *і* ***прыстаўку***.)

— Якая літара выдзелена ў словах пад пунктам 2? Які гук яна абазначае? Назавіце другі крок у выбары напісання літар *з, с* у прыстаўках. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 2 патрэбным словам: *Знаходзім першы гук* ***кораня***.)

— Якая характарыстыка даецца першаму зычнаму гуку кораня пад пунктам 3? Калі першы зычны кораня звонкі (глухі), то якую літару трэба напісаць у прыстаўцы? Назавіце трэці крок у выбары напісання літар *з, с* у прыстаўках. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 3 патрэбнымі словамі: *Калі першы зычны кораня звонкі, пішам* ***літару з,*** *калі глухі — пішам* ***літару с***.)

— Пералічыце яшчэ раз паслядоўнасць дзеянняў пры выбары напісання літар *з, с* у прыстаўках. (Адзін з вучняў узнаўляе алгарытм. Настаўнік вывешвае на дошку адпаведны плакат.)

***2. Калектыўная праца па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі са словамі:

Бя(з/с)воблачны, бя(з/с)кроўны, бя(з/с)концы,
бя(з/с)водны, бя(з/с)донны, бя(з/с)снежны,
бя(з/с)дымны, бя(з/с)людны;
ра(з/с)кацісты, ра(з/с)весісты, ра(з/с)кідзісты,
ра(з/с)кладны, ра(з/с)варысты, ра(з/с)галісты.

— Закрэсліце ў дужках непатрэбныя літары. (Вучні закрэсліваюць непатрэбныя літары ў дужках, па чарзе каменціруюць выбар напісання літары *з* або *с* у прыстаўках.)

***3. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 28.

— Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі. Звярніце ўвагу на тое, куды падае націск у словах. (Вучні запісваюць словы ў сшыткі, па чарзе вызначаюць націскныя склады ў словах, каменціруюць выбар прыстаўкі.) Якімі галоснымі адрозніваюцца прыстаўкі ў парах слоў? Растлумачце правапіс *е, я* ў прыстаўках.

Сярод запісаных слоў знайдзіце сінонімы да слоў *слабы, ціхі. (Бездапаможны, бязветраны.)*

***Развіццё маўлення.***

На дошцы запісаны сказы:

*Бабуля абавязкова выгадуе* ***слабае*** *цыпля.*

*Дзеці адпачывалі на рэчцы* ***ціхім*** *летнім днём.*

— Замяніце выдзеленыя словы ў сказах сінонімамі.

Практыкаванне 29.

— Замяніце разгорнутае тлумачэнне адным словам. (Вучні па чарзе дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) Запішыце словы, якія вы ўтварылі. У запісаных словах вызначыце націск, абазначце корань і прыстаўку. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія — у сшытках.)

Практыкаванне 30.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае верш, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Што ў ім праўдзівае, а што казачнае? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Што вы ведаеце пра каметы? (Усе, хто жадае, выказваюць свае меркаванні.) Мы атрымалі некалькі розных адказаў на гэтае пытанне. Каб праверыць правільнасць адказаў, вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі зорнага неба, могуць выканаць дома заданне для эрудытаў на с. 18.

Спішыце верш Г. Аўласенкі «Камета», устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах. Растлумачце іх правапіс. (Пасля самастойнага выканання задання праводзіцца калектыўная праверка напісанага.) Назавіце ў вершы словы, правапіс якіх трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачныя словы. (Вучні па чарзе падбіраюць праверачныя словы да слоў *абарот, раз, год, хвост.*)

Практыкаванне 31.

— Прачытайце народныя прыметы і запомніце іх. Растлумачце правапіс прапушчаных літар. (Тры вучні чытаюць сказы, тлумачаць правапіс прапушчаных літар у прыстаўках.) Запішыце адну з народных прымет па памяці. У выдзеленых словах абазначце прыстаўку. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы змешчаны апорныя схемы і малюнкі, зробленыя вучнямі.

— З апорай на любую схему або малюнак раскажыце правіла правапісу прыставак, якія заканчваюцца на *з, с*. Ад чаго залежыць правапіс *е, я* ў прыстаўках *без-/бяз-, бес-/бяс-*? Прывядзіце прыклады слоў з прыстаўкамі *без-, бес-*. (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Прывядзіце прыклады слоў з прыстаўкамі *бяз-, бяс-*. (Выслухоўваюцца адказы вучняў.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 32.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе знайсці сярод слоў сінонімы, запісаць іх парамі, уставіць у словы патрэбныя літары і абазначыць прыстаўкі. З двума словамі на выбар трэба будзе скласці і запісаць сказы. Тым вучням, якія будуць рыхтаваць вуснае паведамленне пра каметы (2–3 сказы), складаць і запісваць сказы са словамі з практыкавання не трэба.

## Урок 46. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўку і корань у словах, пазнаёміць з умовамі падваення зычных на стыку прыстаўкі і кораня, фарміраваць навык правапісу слоў з падвоенымі зычнымі; развіваць арфаграфічную пільнасць, граматычны лад маўлення навучэнцаў; выхоўваць патрыятычныя пачуцці, павагу да герояў Вялікай Айчыннай вайны.

***Абсталяванне:*** плакат з алгарытмам выбару напісання *з, с* у прыстаўках.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце пары сінонімаў, якія вы запісалі. Назавіце прыстаўкі, якія вылучылі ў словах. Прачытайце сказы, якія склалі і запісалі. Што вы можаце расказаць пра каметы? (Заслухоўваюцца паведамленні падрыхтаваных вучняў. Паведамленне можа быць прыкладна такім: *Камета — невялікае нябеснае цела, якое рухаецца вакол Сонца па выцягнутай арбіце. Яно мае «галаву» і «хвост». Галаву каметы ўтварае ядро і воблака пылу і газы вакол ядра. Пры набліжэнні да Сонца яркасць «галавы» каметы павялічваецца і з'яўляецца «хвост» з пылу і газы. Яркасць каметы залежыць ад адлегласці да Сонца. З усіх камет толькі маленькая частка набліжаецца да Сонца і Зямлі настолькі, каб іх можна было заўважыць простым вокам. Самыя прыметныя з іх часам называюць «вялікімі каметамі».*)

**II. Паўтарэнне.**

***Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

— Паглядзіце на плакат. (На дошцы вісіць плакат, на якім адлюстраваны алгарытм выбару напісання *з, с* у прыстаўках, пры гэтым апісанне другога і трэцяга крокаў алгарытму закрыта палоскамі паперы.) Аднавіце паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні прыстаўкі ў слове. (Дзеці называюць паслядоўнасць дзеянняў, настаўнік адкрывае апісанне другога і трэцяга крокаў алгарытму.)

На дошцы запісаны словы:

Б(я/е)злюдны, б(я/е)задмоўны, б(я/е)заварыйны, б(я/е)змежны, б(я/е)звыходны, б(я/е)здрадасны, б(я/е)здакорны, б(я/е)злітасны, б(я/е)ззубы, б(я/е)зыме́нны.

— Размяркуйце словы на дзве групы. Запішыце іх, раскрываючы дужкі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі настаўнік просіць назваць прыметы, па якіх словы былі аб'яднаны ў групы. Праводзіцца калектыўная праверка напісанага.) Ад чаго залежыць правапіс *е, я* ў прыстаўках *без-/бяз-, бес-/бяс-*?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з некаторымі выпадкамі падваення зычных у словах.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 33.

— Спішыце словы. Выдзеліце ў іх корань і прыстаўку. Падкрэсліце ў іх апошнюю літару прыстаўкі і першую літару кораня. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.) Чаму ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?

***Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 20.

— Калі можа адбывацца падваенне літар у слове?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна.

Практыкаванне 34.

— Запішыце спалучэнні слоў, дапісваючы ў словы патрэбныя прыстаўкі. (Чатыры вучні запісваюць спалучэнні слоў на дошцы, астатнія — у сшытках.) З выдзеленым спалучэннем слоў вусна складзіце сказ. (Заслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў.)

***Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».***

На дошцы запісаны сказы:

1) На сустрэчы з ветэранамі вайны вучні ... ... за перамогу.

2) Сяргейка ... ... за дапамогу ў выкананні дамашняга задання.

3) Трэба ... ... за клопат пра цябе.

— Прачытайце спалучэнні слоў у рубрыцы на с. 21. Якія аднакаранёвыя словы сустрэліся ў спалучэннях? Вусна дапоўніце спалучэннямі слоў з рубрыкі сказы, запісаныя на дошцы. Пры неабходнасці змяніце формы аднакаранёвых слоў. (Вучні складаюць розныя варыянты сказаў.)

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 35.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае верш, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Да чаго заклікае паэт у вершы? Назавіце пабуджальны сказ. Спішыце. Знайдзіце ў вершы словы з прыстаўкамі і абазначце гэтую частку слоў. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.)

***Развіццё маўлення.***

— Якая прыстаўка сустракаецца ў словах часцей за ўсё? Для чаго аўтар выкарыстоўвае шмат слоў з гэтай прыстаўкай? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў. Засяроджваецца ўвага дзяцей на тым, што словы з прыстаўкай *ад-* падказваюць чытачам, што ваенныя дзеянні скончыліся, засталіся ў мінулым.) У якія дзяржаўныя святы ўшаноўваецца памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны? Ці ведаеце вы сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Запытайцеся пра іх у бацькоў. Па магчымасці прынясіце ў клас на наступны ўрок беларускай мовы фотаздымкі гэтых людзей і раскажыце, як яны набліжалі Дзень Перамогі.

Практыкаванне 36.

— Прачытайце тэкст. (Вучні ланцужком чытаюць тэкст.) З чым параўноўвае аўтар кветкі на палянцы? *(З вясёлкай.)* Звярніцеся да слоўніка і адкажыце, якое значэнне мае слова *раскашу́е*. Выпішыце выдзеленыя словы, устаўляючы патрэбныя літары на месцы пропускаў.

Выдзеліце ў словах прыстаўкі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісаны наступныя спалучэнні слоў:

*а(б,бб)ёгаць усе двары* *ра(с,сс)ыпаць па падлозе*
*а(д,дд)ыхнуць з дарогі* *бя(з,зз)убая рыба*

— Прачытайце спалучэнні слоў. Закрэсліце ў дужках непатрэбныя літары. Назавіце ў словах корань і прыстаўку. (Вучні па чарзе выходзяць да дошкі, закрэсліваюць у слове непатрэбную літару, называюць і выдзяляюць корань і прыстаўку.) Калі можа адбывацца падваенне літар у слове?

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 37.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спачатку выпісаць прыказкі, а потым, з новага радка, — народныя прыметы. У словы трэба будзе ўставіць патрэбныя літары і растлумачыць іх правапіс. На наступны ўрок па жаданні можна прынесці фотаздымкі сваякоў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, і расказаць пра іх.

## Урок 47. Апостраф у словах з прыстаўкамі

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўку і корань у словах, фарміраваць навык правапісу апострафа ў словах з прыстаўкамі; адпрацоўваць навык правапісу слоў з прыстаўкамі на *з-(с-)* і *аб-, ад-, над-, пад-*; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае маўленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі, схемы правапісу апострафа ў словах, малюнак сабакі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце прыказкі, якія запісалі. Чаму так гавораць? Якія літары вы ўставілі ў словы *аддзячаць, зманіш*? Чаму? Прачытайце народныя прыметы, якія запісалі. Якія літары вы ўставілі ў словы *расселіся, спявае*? Чаму?

Хто з вас прынёс фотаздымкі сваякоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і можа расказаць пра іх? (Падрыхтаваныя вучні дэманструюць партрэты і расказваюць пра сваіх продкаў. Настаўнік можа расказаць дзецям пра патрыятычную акцыю «Бессмяротны полк», якая праводзіцца ў больш за 80 краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі, а таксама пра рэспубліканскую акцыю «Беларусь памятае».)

**II. Паўтарэнне.**

***Самастойная работа па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі са словамі.

| |
|---|
| А(б,бб)думаць адказ, а(б,бб)удаваць парк;<br>а(д,дд)аць кнігу, а(д,дд)казаць на пытанне;<br>ра(с,сс)тавіць на паліцы, ра(с,сс)тлумачыць вучням;<br>бя(з,зз)бройны салдат, бе(з,зз)бярэжнае мора. |

— Закрэсліце ў дужках непатрэбныя літары. (Вучні закрэсліваюць непатрэбныя літары. Пасля заканчэння працы настаўнік прад'яўляе на дошцы ўзор правільнага выканання задання. Праводзіцца самаправерка напісанага.) Калі можа адбывацца падваенне літар у слове?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы прыгадаем правіла правапісу апострафа ў словах і пазнаёмімся з выпадкамі напісання апострафа пасля прыставак.

***2. Праца з падручнікам.***

— Успомніце, калі пішацца апостраф. (Пры неабходнасці настаўнік дэманструе наступную схему (падручнік, частка 1, с. 16), пры дапамозе якой вучні ўзнаўляюць адпаведнае правіла.)




Практыкаванне 38.

— Утварыце словы па схеме пры дапамозе прыставак. Па якой прымеце іх можна падзяліць на дзве групы? *(Словы з апострафам і без яго.)* Запішыце словы ў два слупкі. Выдзеліце ў словах прыстаўкі. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.)

***Праца з правілам.***

— Паспрабуйце сфармуляваць правіла правапісу апострафа пасля прыставак. (Вучні фармулююць правіла, параўноўваюць уласную фармулёўку з правілам на с. 23. Звяртаецца ўвага на тое, што апостраф пішацца пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны гук, перад літарамі *е, ё, ю, я, і*, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й].)

Практыкаванне 39.

— Прачытайце. Назавіце словы, у якіх на месцы пропускаў трэба пісаць апостраф. (Вучні па чарзе называюць словы.) Запішыце гэтыя словы. Выдзеліце ў іх прыстаўкі. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф. (Вучні самастойна запісваюць словы, вылучаюць у іх прыстаўкі, падкрэсліваюць адпаведныя літары. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 40.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае верш, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Чаму хлопчык напісаў аб'яву? Што ён у ёй указаў? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) У якія словы трэба ўставіць апостраф замест пытальніка? *(Аб'явы, сур'ёзныя.)* Запішыце гэтыя словы. У якім з гэтых слоў ёсць прыстаўка? *(Аб'ява.)*

***Развіццё маўлення.***



— Для чаго яшчэ людзі пішуць аб'явы? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Уявіце сабе, што вы знайшлі ў парку сабаку, які згубіўся. (Настаўнік вывешвае на дошку фотаздымак сабакі.)

— Давайце саставім аб'яву для яго гаспадароў. Карыстайцеся падказкай з практыкавання. (Вучні дапаўняюць тэкст аб'явы на с. 24 патрэбнымі словамі.) Запішыце аб'яву, якая атрымалася. (Адзін вучань запісвае тэкст на дошцы, астатнія — у сшытках.)

Практыкаванне 41.

— Да слоў з левага слупка падбярыце антонімы з правага слупка. (Вучні знаходзяць пары антонімаў.) Запішыце словы парамі. Пры неабходнасці ўстаўце на месцы пропускаў апостраф. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія — у сшытках.) Выдзеліце ў словах прыстаўкі. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

З адной парай антонімаў складзіце сказы. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Выбіраюцца і запісваюцца два найбольш удалыя сказы.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы змешчана схема:



— Калі пасля прыставак пішацца апостраф? Дапоўніце схему на дошцы патрэбным словам. Прывядзіце прыклады слоў, у якіх пасля прыстаўкі пішацца апостраф.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 42.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вы спачатку выпішыце народныя прыметы, а потым, з новага радка, — прыказкі. Замест пытальніка, пры неабходнасці, устаўце ў словы апостраф. У выдзеленых словах абазначыце прыстаўкі і падкрэсліце першую літару кораня.

## Урок 48. Напісанне прыставак і прыназоўнікаў

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць прыстаўку ў словах, фарміраваць навык правапісу прыставак і прыназоўнікаў; узбагачаць граматычны лад маўлення навучэнцаў, развіваць назіральнасць; выхоўваць павагу да мудрасці продкаў, імкненне дакладна выкарыстоўваць прыказкі ў сваім маўленні.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі, схема правапісу апострафа пасля прыставак.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце народныя прыметы, якія запісалі. Які знак вы ўставілі ў словы *з'яўляецца, надвор'ю, з'яўленне*? Чаму? Прачытайце прыказкі, якія запісалі. Чаму так гавораць? Назавіце ў іх словы з апострафам. Якія прыстаўкі вы абазначылі ў выдзеленых словах? Калі ў словах пасля прыставак пішацца апостраф? (Настаўнік вывешвае на дошку адпаведную схему. Вучні ўзнаўляюць правіла з апорай на схему.)

**II. Паўтарэнне.**

***Самастойная праца па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі са словамі:

Пад..ехаць, аб..яднаць, без..валосы, ус..крыкнуць, па..насіць, уз..весці, без..языкі, пад..ём, пад..бегчы, раз..яднацца, раз..ехацца.

— Прачытайце словы. Дапішыце, калі трэба, пасля прыстаўкі апостраф. У астатніх словах злучыце апошнюю літару прыстаўкі з першай літарай кораня. (Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы будзем вучыцца адрозніваць прыстаўкі ад сугучных прыназоўнікаў і правільна пісаць прыстаўкі і прыназоўнікі.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 43.

— Прачытайце сказы. (Чытанне «ланцужком».) Як называюцца выдзеленыя словы? Як называюцца выдзеленыя часткі ў словах? Чым падобныя прыстаўка і прыназоўнік у кожным сказе? *(Падобныя гучаннем.)* Чым адрозніваецца іх правапіс? (Прыназоўнік пішацца асобна ад наступнага слова.)

***Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што прыстаўка — частка слова, а прыназоўнік — асобнае слова. Каб адрозніць прыназоўнік ад сугучнай прыстаўкі, трэба паставіць паміж прыназоўнікам і наступным словам яшчэ адно слова. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 26.) Настаўнік запісвае на дошцы спалучэнне *(за)ехаць (за)паварот*, вучні калектыўна спрабуюць адрозніць прыстаўку і сугучны прыназоўнік: *заехаць за* ***бліжэйшы*** *паварот.*

Практыкаванне 44.

— Утварыце спалучэнні слоў па схемах і запішыце іх. Выдзеліце ў словах прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі. (Адзін вучань запісвае спалучэнні слоў на дошцы, астатнія — у сшытках.) Што змянілася ў выдзеленых словах пры ўтварэнні спалучэнняў слоў? Абазначце ў іх канчаткі.

Практыкаванне 45.

— Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб атрымаліся правільныя выказванні. Якая частка слова выконвае тую ж ролю у сказе, што і прыназоўнік? *(Канчатак.)*

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 46.

— Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? (Вучні па чарзе чытаюць прыказкі, тлумачаць іх сэнс.) Спішыце, раскрываючы дужкі. Выдзеліце ў словах прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі. (Вучні па чарзе каменціруюць правапіс прыставак і прыназоўнікаў у кожнай прыказцы.)

Практыкаванне 47.

— Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце іх супрацьлеглымі па сэнсе. (Вучні па чарзе ўтвараюць супрацьлеглыя па сэнсе словазлучэнні да прапанаваных.) Запішыце спалучэнні слоў на ўзор. Падкрэсліце ў іх прыназоўнікі. Абазначце канчаткі ў формах аднаго і таго ж слова. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісаны сказ:

Праз гадзіну падарожнікі **..браліся** ... горада.

— Дапоўніце сказ, запісаны на дошцы, патрэбным прыназоўнікам, а выдзеленае слова — патрэбнай прыстаўкай. (Вучань, які першым дае правільны адказ, выходзіць да дошкі і дапісвае ў слова прыстаўку *да-*, а ў сказ — прыназоўнік *да.*) Як адрозніць прыназоўнік ад сугучнай прыстаўкі ў сказе або спалучэнні слоў?

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 48.

— Карыстаючыся падказкамі, прачытайце скорагаворкі У. Мацвеенкі. (Вучні чытаюць скорагаворкі: *Запаўзла піла ў зруб і зламала звонкі зуб. Міла з мылам ляльку мыла, Міла змыліла ўсё мыла.*) Дома вам неабходна будзе запісаць скорагаворкі, выдзеліць прыстаўкі ў словах, падкрэсліць прыназоўнікі. Па жаданні можна навучыцца хутка і правільна вымаўляць адну або ўсе скорагаворкі з практыкавання.

## Урок 49. Суфікс

***Мэты:*** пазнаёміць з суфіксам як значымай часткай слова, яго роляй у слове, вучыць знаходзіць суфіксы ў словах і абазначаць іх графічна, утвараць словы пры дапамозе суфіксаў; развіваць мысленне навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнікавы запас словамі з памяншальна-ласкальным адценнем; выхоўваць уважлівае стаўленне да слова.

***Абсталяванне:*** схема з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце запісаныя скорагаворкі. Назавіце ў іх словы з прыстаўкамі. *(Запаўзла, зруб, зламала, змыліла.)* Якія прыстаўкі вы вылучылі ў гэтых словах? Ад чаго залежыць правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з, с*? Якія прыназоўнікі ёсць у скорагаворках? (*У, з.* Звяртаецца ўвага вучняў на тое, што слова і не з'яўляецца прыназоўнікам.) Як вы іх напісалі?

**II. Паўтарэнне.**

***Самастойная праца па заданні на дошцы.***

На дошцы запісаны наступныя спалучэнні слоў:

*(Ад)даліліся (ад)возера, (ад)дзякаваў бабулі (за)дапамогу, (за)йшло (за)хмары, (па)радаваўся (за)сябра, (рас)смяшыў дзяцей (у)цырку, ад(?)ехаў (ад)прыпынку.*

— Прачытайце спалучэнні слоў. Спішыце, раскрываючы дужкі. Выдзеліце прыстаўкі ў словах, падкрэсліце прыназоўнікі. (Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.) Як адрозніць прыназоўнік ад прыстаўкі ў сказе або спалучэнні слоў? Калі можа адбывацца падваенне літар у слове? Калі пасля прыставак пішацца апостраф?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з адной часткай слова.

***2. Праца з падручнікуам.***

Практыкаванне 49.

— Разгледзьце малюнкі. Дапоўніце подпісы пад імі аднакаранёвымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе. *(Грузавая **машына**, **машыннае** масла, маленькая **машынка**, **машыніст** цеплавоза.)* Запішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань і канчатак. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія — у сшытках.) Ад якога слова і пры дапамозе чаго ўтварыліся словы *машынка, машыніст, машыннае*? Выдзеліце гэтыя часткі слоў спецыяльным знакам. (Настаўнік дэманструе на прыкладзе слова машыннае, як выдзеліць суфікс у слове.) Дзе яны знаходзяцца ў слове: перад коранем ці пасля яго?

***Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 30.

— Што такое суфікс?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 50.

— Прачытайце. Знайдзіце сярод прапанаваных слоў аднакаранёвыя да слова *рыба*. Запішыце іх. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія — у сшытках.) Як адрозніваюцца па значэнні аднакаранёвыя словы? *(Рыба — вадзяная жывёліна, якая дыхае жабрамі і звычайна пакрытая луской; рыбка — невялікая рыба, рыбны — які мае адносіны да рыбы, уласцівы ёй.)* Выдзеліце ў іх корань і суфікс. (Аналагічна вылучаюцца і запісваюцца астатнія групы аднакаранёвых слоў.)

Практыкаванне 51.

— Утварыце словы пры дапамозе суфіксаў на ўзор. (Адзін вучань запісвае словы на дошцы, астатнія — у сшытках.) Якое значэнне (памяншальна-ласкальнае ці павелічальнае) надаюць гэтыя суфіксы словам?

***Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што кожны суфікс мае сваё значэнне. Суфіксы *-еньк-, -аньк-, -эньк-, -к-, -ік-,-ык-, -ок-* надаюць значэнню слова памяншальна-ласкальнае адценне. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 31.) На дошцы вывешваецца схема:

| ***суфіксы*** | |
|---|---|
| *-еньк-*<br>*-аньк-*<br>*-эньк-*<br>*-к-*<br>*-ік-*<br>*-ык-*<br>*-ок-* | ***памяншальна-ласкальнае адценне*** |

Практыкаванне 52.

— Прачытайце тэкст. (Два вучні чытаюць тэкст па частках, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Чаму замаркоціўся Міхаська? Як суцешыў яго дзед? Якая прыказка сустрэлася ў тэксце? *(Два дажджы ў маі — і не дбай аб ураджаі.)* Знайдзіце ў тэксце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. *(Дождж**ык**, Міхась**ка**, нож**ка**мі, унуч**ак**, траў**ка**.)* Назавіце ў іх суфіксы. Чаму аўтар часта выкарыстоўвае такія словы? *(Каб перадаць ласкавыя і пяшчотныя адносіны дзядулі да ўнука. Каб паказаць, што дзеянне адбываецца вясной, калі трава яшчэ маладая, а дождж цёплы і ласкавы.)* Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы, назавіце іх. *(Дождж<u>ык</u> — дождж, унучак — унук, расці — падрастуць.)*

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 53.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае верш, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Якія словы дапамагаюць перадаць ласкавыя адносіны аўтара і дзяцей да коціка? *(Коцік, спінку, жывоцік, лапкі, хвосцік, коце, мілы.)* Якія з гэтых слоў маюць памяншальна-ласкальныя суфіксы? Назавіце гэтыя суфіксы. Спішыце. (Вучні самастойна запісваюць верш.) У выдзеленых словах абазначце канчатак, корань і суфікс. (Адзін вучань выходзіць да дошкі, запісвае выдзеленыя словы, робіць іх разбор па саставе. Астатнія выконваюць заданне ў сшытках.) Знайдзіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. *(Коцік, коціка.)* Якія канчаткі яны маюць?

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісаны словы *дом, домік, дамавы.*

— З якой часткай слова пазнаёміліся на ўроку? Што такое суфікс? Прачытайце словы, запісаныя на дошцы. Што іх аб'ядноўвае? Выдзеліце ў словах корань, канчатак і суфікс, калі ён ёсць. (Адзін вучань выходзіць да дошкі і разбірае словы па саставе.) Назавіце слова з памяншальна-ласкальным суфіксам.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практ. 54.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе адгадаць загадку, з «рассыпаных» літар скласці і запісаць слова-адгадку. Акрамя таго, трэба будзе спісаць загадку, у выдзеленых словах абазначыць суфіксы.

## Урок 50. Суфікс

***Мэты:*** развіваць уменне ўтвараць словы пры дапамозе суфіксаў, знаходзіць суфіксы ў словах і абазначаць іх графічна, пазнаёміць са значэннямі некаторых суфіксаў; узбагачаць слоўнік навучэнцаў словамі — назвамі дзіцянят жывёл, словамі — назвамі прафесій, развіваць мысленне; выхоўваць павагу да працоўных людзей.

***Абсталяванне:*** плакат з алгарытмам вызначэння суфікса ў слове, схема з суфіксамі і іх значэннямі, карткі са словамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце загадку. Якую яна мае адгадку? Словы з якім значэннем выкарыстоўвае аўтар для апісання маладзіка? *(З памяншальна-ласкальным: маленькі, рожкі, хмаркі.)* З чым ён параўноўвае поўню? *(З агністым шарам.)* Якія суфіксы вы абазначылі ў словах? Што такое суфікс?

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з некаторымі суфіксамі і іх значэннямі.

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 55.

— Прачытайце скорагаворку. (Адзін вучань чытае скорагаворку.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе. (Некалькі вучняў спрабуюць хутка і правільна вымавіць скорагаворку.) Спішыце. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках.) Сярод выдзеленых слоў знайдзіце тыя, якія маюць памяншальна-ласкальнае значэнне. Выдзеліце ў іх суфіксы. *(Каза**чк**і, кура**чк**і, гуса**чк**і, мама**чк**і.)* Якія адносіны да матуль перадаюцца ў скорагаворцы пры дапамозе слоў з памяншальна-ласкальным значэннем? *(Ласкавыя, пяшчотныя.)* Назавіце ў скорагаворцы словы — назвы дзіцянят жывёл. Выдзеліце ў іх суфіксы. *(Каз**ля**ня, але**ня**ня, кур**а**ня, гус**я**ня.)*

***Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што пры дапамозе суфіксаў *-ан-*, *-ян-* утвараюцца словы — назвы дзіцянят жывёл. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 33.) На дошцы вывешваецца дапоўненая схема:

| ***суфіксы*** | |
|---|---|
| *-еньк-*<br>*-аньк-*<br>*-эньк-*<br>*-к-*<br>*-ік-*<br>*-ык-*<br>*-ок-* | ***памяншальна-ласкальнае адценне*** |
| *-ан-*<br>*-ян-* | ***утвараюць словы — назвы дзіцянят жывёл*** |

Практыкаванне 56.

— Утварыце аднакаранёвыя словы на ўзор, абазначце ў іх суфіксы. (Чатыры вучні па чарзе выходзяць да дошкі, запісваюць «ланцужкі» аднакаранёвых слоў, абазначаюць у словах суфіксы. Астатнія запісваюць словы ў сшыткі.)

Практыкаванне 57.

— Давайце звернемся да практыкавання 57 і складзём па падказках алгарытм вызначэння суфікса ў слове *гусачка*.

— Прачытайце словы пад пунктам 1. Якія гэта словы? Назавіце першы крок у вызначэнні суфікса ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 1 патрэбным словам: *Змяняем **слова**.*)

— Якая частка выдзелена ў слове пад пунктам 2? Назавіце другі крок у вызначэнні суфікса ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 2 патрэбным словам: *Знаходзім у слове **канчатак**.*)

— Прачытайце словы пад пунктам 3. Якія гэта словы? Назавіце трэці крок у вызначэнні суфікса ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 3 патрэбным словам: *Падбіраем да слова **аднакаранёвыя** словы.)*

— Якая частка выдзелена ў словах пад пунктам 4? Назавіце чацвёрты крок у вызначэнні суфікса ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 4 патрэбным словам: *Знаходзім у аднакаранёвых словах **корань.***)

— Якая частка выдзелена ў слове пад пунктам 5? Назавіце пяты крок у вызначэнні суфікса ў слове. (Навучэнцы дапаўняюць сказы з пункта 5 патрэбнымі словамі: *Частка слова, якая стаіць пасля кораня і перад канчаткам, будзе **суфіксам**. Абазначаем суфікс ў слове **спецыяльным знакам.***)

— Пералічыце яшчэ раз паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні суфікса ў слове. (Адзін з вучняў узнаўляе алгарытм. Настаўнік вывешвае на дошку адпаведны плакат.)

Практыкаванне 58.

— Прачытайце тэкст. (Адзін вучань чытае тэкст, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якую назву можна яму даць? *(Барсучкі.)* Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. *(Барсучкі, маладзенькія, сонейка, лапкі, кусціка.)* Для чаго аўтар выкарыстоўвае іх? *(Каб паказаць, што барсучкі маленькія, каб перадаць пяшчотныя адносіны да іх.)* Выпішыце аднакаранёвыя словы. *(Барсукова — барсучкі — барсучыха.)* Выдзеліце ў іх канчатак, корань, суфікс. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках.) Як па-іншаму можна назваць барсучкоў? *(Барсучаняты.)* Выпішыце з тэксту словы з памяншальна-ласкальным значэннем, выдзеліце ў іх суфіксы. (Пасля самастойнага запісу слоў вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

***Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».***

На дошцы запісаны сказы. Справа ў слупку прапанавана значэнне ўстойлівых выразаў:

| | |
|---|---|
| Адно Святланцы было **ў руку**, што частку дамашняга задання яна ўжо выканала. | *задавальняла яе* |
| Андрэйка апрануўся **на скорую руку** і пабег да сяброў. | *паспешліва, наскора, не трацячы часу* |
| **Пад гарачую руку** Паўлік даў абяцанне сябрам і быў вымушаны памяняць свае планы на вечар. | *у стане ўсхваляванасці, запальчывасці, раздражнення* |

— Што абазначае выраз *ім гэта на руку*, ужыты ў тэксце практыкавання 58? Прачытайце спалучэнні слоў у рубрыцы на с. 35. Якое значэнне яны маюць у сказах, запісаных на дошцы?

Практыкаванне 59.

— Утварыце аднакаранёвыя словы на ўзор, абазначце ў іх суфіксы. Што абазначаюць гэтыя словы? (Чатыры вучні па чарзе выходзяць да дошкі, запісваюць пары аднакаранёвых слоў, абазначаюць у словах суфіксы, тлумачаць значэнне ўтвораных слоў. Астатнія запісваюць словы ў сшыткі.)

***Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што пры дапамозе суфіксаў *-іст-*, *-ыст-*, *-ар-*, *-ор-*, *-чык-*, *-шчык-* утвараюцца словы — назвы людзей паводле іх заняткаў, прафесій. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 36.) На дошцы вывешваецца дапоўненая схема:

| ***суфіксы*** | |
|---|---|
| *-еньк-*<br>*-аньк-*<br>*-эньк-*<br>*-к-*<br>*-ік-*<br>*-ык-*<br>*-ок-* | ***памяншальна-ласкальнае адценне*** |
| *-ан-*<br>*-ян-* | ***утвараюць словы — назвы дзіцянят жывел*** |
| *-іст-*<br>*-ыст-*<br>*-ар-*<br>*-ор-*<br>*-чык-*<br>*-шчык-* | ***утвараюцца словы — назвы людзей паводле іх заняткаў, прафесій*** |

**III. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 60.

— Дапоўніце сказы патрэбнымі аднакаранёвымі словамі. Выдзеліце ў гэтых словах корань і суфікс. (Тры вучні па чарзе выходзяць да дошкі, запісваюць сказы, выдзяляюць у словах *пошта, паштовая, паштальён* корань і суфікс.) Знайдзіце ў сказах формы аднаго і таго

ж слова. Выдзеліце ў іх канчатак. *(Пошта — пошты — пошту; паштовая — паштовы.)* Назва якой прафесіі сустрэлася ў сказах. Растлумачце правапіс *ь* у суфіксе.

***Праца са слоўнікавым словам*** **пошта.**

— Сярод іншых слоў вы запісалі слова *пошта*. Гэта слоўнікавае слова. Перакладзіце яго на рускую мову. Якім гукам адрозніваецца беларускае слова ад адпаведнага рускага?

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы прымацаваны карткі са словамі:

*кацяня, журналіст, шпачаня, лётчык, кураня, кухар.*

— На якія дзве групы можна падзяліць гэтыя словы? (Вучні выказваюць свае меркаванні. Адзін з іх выходзіць да дошкі і размяшчае словы ў два слупкі.) Назавіце суфіксы ў словах — назвах дзіцянят жывёл. Назавіце суфіксы ў словах — назвах людзей паводле іх прафесій.

**V. Дамашняе заданне.**

Практ. 61.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання неабходна знайсці ў кожным радзе слоў лішняе, вызначыць, што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожным радзе, і запісаць іх. У запісаных словах трэба абазначыць суфіксы.

## Урок 51. Суфікс

***Мэты:*** развіваць уменне вызначаць корань і суфікс у словах, пазнаёміць з умовамі падваення зычных на стыку кораня і суфікса, фарміраваць навык правапісу слоў з падвоенымі зычнымі; развіваць арфаграфічную пільнасць, узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў; выхоўваць уважлівае стаўленне да слова.

***Абсталяванне:*** плакат з алгарытмам вызначэння суфікса ў слове, схема правапісу падвоеных літар у словах.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першую запісаную групу слоў. Што яны абазначаюць? Які суфікс маюць? Прачытайце другую групу слоў. Што яны абазначаюць? Які суфікс маюць? Якое адценне надае значэнню слоў суфікс *-еньк-*? (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі групамі слоў.)

**II. Паўтарэнне.**

***Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

На дошцы запісаны жарт:

> *— Дачушка, збегай і паглядзі, ці прыйшла ўжо пошта.*
>
> *— Няўжо пошта ўмее хадзіць? — здзівілася маленькая Аленка.*

— Прачытайце жарт. Што выклікала ў вас ўсмешку? Назавіце слова ў тэксце, ужытае ў пераносным значэнні. *(Прыйшла.)* Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Выдзеліце ў іх суфіксы. (Вучні па чарзе называюць словы з памяншальна-ласкальным значэннем, выходзяць да дошкі, выдзяляюць у іх суфіксы.) Выпішыце з тэксту слоўнікавае слова. Падбярыце і запішыце аднакаранёвыя яму словы. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

— Паглядзіце на плакат. (На дошцы вісіць плакат, на якім адлюстраваны алгарытм вызначэння суфікса ў слове, пры гэтым апісанне другога і чацвёртага крокаў алгарытму закрыта палоскамі паперы.) Аднавіце паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні суфікса ў слове. (Дзеці называюць паслядоўнасць дзеянняў, настаўнік адкрывае апісанне другога і чацвёртага крокаў алгарытму.)

**III. Вывучэнне новага матэрыяла.**

***1. Актуалізацыя ведаў вучняў.***

На дошку вывешваецца схема.

1) кало[с']е — кало[с][с]е, збо[ж']а — збо[ж][ж]а, насе[н']е — насе[н][н]е

2)  бя**сс**трашны, бя**зз**убы

— Успомніце, калі ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары. Выкарыстайце схему, змешчаную на дошцы.

***2. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з адным выпадкам падваення зычных у словах.

***3. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 62.

— Утварыце аднакаранёвыя словы на ўзор. Выдзеліце ў іх корань і суфікс. (Два вучні па чарзе выходзяць да дошкі, утвараюць і запісваюць пары аднакаранёвых слоў, абазначаюць у словах корань і суфікс.) Чаму ва ўтвораных вамі словах пішуцца дзве літары н?

Практыкаванне 63.

— Разгледзьце ланцужкі слоў. Прасачыце, як утвараліся словы. Ад якога слова і пры дапамозе чаго ўтварылася слова *гадзінны*? Ад якога слова і пры дапамозе чаго ўтварылася слова *гадзіннік*? Колькі суфіксаў у слове *гадзіннік*? (Аналагічна аналізуюцца астатнія ланцужкі слоў.) Чаму ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?

***Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 38.

— Калі можа адбывацца падваенне літары *н* у слове? Дзеці перачытваюць правіла самастойна.

***Праца са слоўнікавым словам дзённік.***

— З практыкавання 63 выпішыце ланцужок слоў, у якім ёсць слоўнікавае слова. Складзіце сказ з гэтым словам. (Выслухоўваюцца сказы некалькіх вучняў, выбіраецца і запісваецца з каменціраваннем найбольш удалы сказ.)

Практыкаванне 64.

— Прачытайце тэкст. (Адзін вучань чытае тэкст, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якія бываюць гадзіннікі? Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. У выдзеленых словах абазначце корань і суфікс. (Вучні запісваюць тэкст і робяць з каменціраваннем частковы марфемны разбор слоў.) Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. *(**Гадзін**нікамі — **гадзін**у, **будз**ільнікам — па**будз**іць.)* Знайдзіце ў тэксце формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі. *(Гадзіннік**амі**, гадзіннік**аў**.)*

**IV. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 65.

— Прачытайце словы. На якія дзве групы можна падзяліць іх? *(Словы, у якіх пішацца адна літара* н, *і словы, у якіх адбываецца падваенне літары* ***н***.) Выпішыце тыя словы, у якіх трэба пісаць дзве літары ***-нн-***. Абазначце ў іх корань і суфікс. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках.) Якія яшчэ літары падвойваюцца ў слове *бяссонны*? Чаму? Выдзеліце прыстаўку ў гэтым слове.

Практыкаванне 66.

— Прачытайце прыказку. Калі так гавораць? *(Калі адзін чалавек ужо даўно працуе, а другі толькі пачынае працу.)* Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запомніце прыказку. Запішыце яе па памяці. Абазначце ўсе часткі ў слове *ранні*. (Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісаны наступныя спалучэнні слоў:

| | |
|---|---|
| *тума(н,нн)ы ранак* | *со(н,нн)ы хлопчык* |
| *галод(н,нн)ы воўк* | *мод(н,нн)ы абутак* |

*Дапоўніце кожны слупок слоў двума сваімі прыкладамі.*

**Варыянт 2**

*1. Прачытайце. У кожным радзе слоў знайдзіце лішняе і закрэсліце яго.*

Сокал, сакаляня, сакавіты, сакаліны.

Сава, саветнік, савіны, савяня.

Арліца, арляня, арліны, армія.

*Абазначце частку, якая аб'ядноўвае словы кожнага рада.*

*2. Прачытайце. Вызначыце, што аб'ядноўвае словы ў кожным радзе. Дапоўніце кожны рад слоў патрэбнымі словамі. Карыстайцеся даведкай.*

а) год, зіма, шкло, __________, __________;

б) мышка, водны, сняжок, __________, __________;

в) перапіска, перасушка, перанóсны, __________, __________.

***Словы для даведкі:*** лета, маленькі, пералётны, конь, ножка, перагрузка.

*3. Размяркуйце словы на дзве групы. Запішыце іх, раскрываючы дужкі. Укажыце прыметы, па якіх словы былі аб'яднаны ў групы.*

бя(з/с)воблачны, бя(з/с)кроўны, бя(з/с)концы, бя(з/с)водны, бя(з/с)сільны, бя(з/с)донны, бя(з/с)снежны, бя(з/с)дымны, бя(з/с)слоўны, бя(з/с)людны.

***прыметы:*** *прыстаўка* ☐ *прыстаўка* ☐

*4. Прачытайце словы ў кожным радку. Якое слова лішняе? Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.*

1) вучань, вучні, вучняў, вучнёўскі;

2) чытальня, чытач, чытанне, чытачы;

3) напісаў, напісала, напісалі, пропісь.

*5. Пад кожнай схемай саставу слова запішыце словы, якія ёй адпавядаюць.*

Хмара, хмарны, захмарны; сталовы, стол, настольны; дарожны, дарога, падарожны.



*Дапоўніце кожны слупок слоў двума сваімі прыкладамі.*

***Самаправерка напісанага.***

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Пры выкананні якіх заданняў кантрольнай работы ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб з лёгкасцю выканаць гэтыя заданні?

**V. Дамашняе заданне.**

Варыянты:

1) Практ. 73.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам трэба будзе дапоўніць сказы патрэбнымі аднакаранёвымі словамі. Аднакаранёвыя словы неабходна будзе разабраць па саставе.

2) Творчае заданне з пр. 72.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вясёлка. — 2014. — № 1. — С. 62.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://upload.wlklmedla.org/wlklpedla/ru/6/64/Slovlansklbazar.jpg; http://www.1001dog.com/wp-content/uploads/2015/01/1301a-25.jpg.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі*

***Пошта.***

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова. Пастаўце ў ім націск.*




______________

*2. Дапішыце ў словы прапушчаныя літары.*

П..штальён, п..шта, п..штоўка, п..штамт.

*Знайдзіце сярод прапанаваных слоў слоўнікавае слова, падкрэсліце яго. Назавіце зычныя гукі ў слоўнікавым слове.*

*3. Прачытайце словы. Што іх аб'ядноўвае?*

Пошта, паштовая, паштоўка, паштальён.

*Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.*

*Дапоўніце гэтымі словамі тэкст.*

Мы прывыклі даставаць з __________ скрыні канверты з лістамі і паштоўкамі. Ці задумваліся вы, як яны даходзяць да нас?

Спачатку чалавек апускае ліст або паштоўку у ________ скрыню. Потым прыходзіць ________ і забірае канверты. Ён прыносіць пошту ў аддзяленне сувязі. Гашэнне марак і штампаванне выконвае машына. Затым лісты і прыгожыя ________ раскладваюць па адрасах адпраўлення. ________ дастаўляецца па чыгунцы і самалётам з горада ў горад. Яна трапляе ў аддзяленні сувязі і перадаецца паштальёнам на адрас.

Вось які складаны шлях праходзяць лісты і паштоўкі.

*(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка» [1])*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай ўкладцы.